УДК 316.77

# САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНАЎЛЕННЕ ЯК ПРАКТЫКА КАНСТРУЯВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

***Аляксей Крывалап***
*Полацк, Беларусь*

Артыкул прысвечаны абгрунтаванню правамернасці выкарыстання канцэпцыі «сацыяльнага станаўлення», якая была прапанавана ў межах сацыялогіі П. Штомкай, а потым актыўны выкарыстоўвалася прадстаўнікамі брытанскіх культурных даследаванняў. Разглядаецца эвалюцыя дадзенай сацыялагічнай канцэпцыі і магчымасці яе выкарыстання ў межах культуралогіі. Мэтай гэтага тэксту з'яўляецца апісанне практыкі сацыяльнага станаўлення як працэсу пад час якога

Полесгу

адбываецца канструяванне культурнай ідэнтычнасці. Паказаны наяўныя абмежаванні выкарыстання канцэпцыі сацыяльнага станаўленне для выкарыстання ў межах культуралагічнага дыскурсу сёння.

***Ключавыя словы: сацыяльная станаўленне, культурная ідэнтычнасць, культуралогія, практыка***

Чым з'яўляецца культурная ідэнтычнасць: наборам каштоўнасцей ці нявызначаным працэсам? Іншымі словамі, гэта можа быць патлумачана як станаўленне і сацыяльны працэс, а можа быць нечым, што дадзена па факце нараджэння. Культурныя даследаванні могуць быць плённым даследчым кірункам, які можа дапамагчы ўнікнуць ад папярэдне вызначанага разумення культуры. Так, для культуралогіі ідэнтычнасць - гэта імкненне да страчанага ідэалу з мінулага. З гэтым звязаны захаванне традыцый і культурна-гістарычнай спадчыны. Для культурных даследаванняў – ідэнтычнасць (у першую чаргу культурная ідэнтычнасць) – гэта працэс станаўлення, стварэння сэнсаў і пэўнай знакавай рэальнасці сённяшняга дня. Іншымі словамі, не арыентацыя на каштоўнасці і здабыткі мінулага, а праекцыя ў будучыню, як пабудова новай ідэнтычнасці. Мэтай гэтага тэксту з'яўляецца апісанне практыкі сацыяльнага станаўлення як працэсу пад час якога адбываецца канструяванне культурнай ідэнтычнасці.

Брытанская школа культурных даследаванняў ставіцца да пытання ідэнтычнасці, як працэсу «сацыяльнага станаўлення» [2], тады як для постсавецкай культуралогіі – гэта ў большай ступені пытанне вяртанне да каранёў і захаванне традыцый. У гэтым магчыма ўбачыць перспектыўнасць выкарыстання культурнай ідэнтычнасці, бо гэта шанец каб выйсці за межы ўсталяванага шаблону – нацыянальная ідэнтычнасці. Гэта не пра этнас ці гістарычную спадчыну, а пра пераасэнсаванне артэфактаў у кантэксце сённяшняга дня. Што гэта значыць сёння? Замест проста перадвызначанага ўхвалення, бо так трэба. Сёння нормай з'яўляецца разуменне непаўторнасці культурнай спадчыны і магчымасць фармалізацыі культуралогіі.

Тэрмін сацыяльнае станаўленне на сённяшні дзень выкарыстоўваецца не толькі ў межах культуралогіі. Іншыя сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны шырока ўжываюць яго для ўласных тлумачэнняў сацыяльных працэсаў. Паліталогія каб зразумець эвалюцыю палітычных поглядаў асобы, культуралогія каб паказаць працэс уключэння ў культуру. Аднак, пры гэтым не заўсёды зразумела якім чынам адбываецца працэс трансфармацыі ў грамадстве. Польскі сацыёлаг Пётр Штомпка ў 1991 годзе ў сваёй працы «Грамадства ў дзеянні: тэорыя сацыяльнага станаўлення» [1] прапанаваў мадэль «сацыяльнага станаўлення» (Social Becoming), якая на сённяшні дзень шырока вядома і актыўна выкарыстоўваецца не толькі сацыёлагамі.

Плённая ідэя паступовай трансфармацыі асобы пад час узаемадзеяння з сацыяльнымі інстытутамі і іншымі актарамі, дазваляе інакш разглядаць працэс эвалюцыі поглядаў як на ўзроўні індывідаў (асобы), так і на калектыўным (групавым) узроўні. Іншымі словамі, канцэпцыя П. Штомпкі можа быць карыснай для разумення механізма сацыяльных трансфармацый на прыкладзе працэсу інкультурацыі ў межах культуралагічнага падыходу. Гэты тэкст прысвечаны эвалюцыі мадэлі «сацыяльнага станаўлення» і пошуку адказу на пытанне: якія перспектывы для культуралогіі адкрывае выкарыстанне дадзенай мадэлі?

Адзін са сваіх тэкстаў, які закранае пытанні сацыяльнага станаўлення П. Штомпка прысвяціў канцэпцыі даверу [3]. На рускую мову гэты тэкст перакладзены як «Доверие - основа общества» і ў ім разглядаецца «культуралагічны паварот у сацыялогіі» [12, с. 46–54]. Аднак праблема ў тым, што П. Штомпа нічога не пісаў пра культуралогію, бо ён у сваім тэксце апісваў менавіта «культуралісткі паварот» (culturalist turn) [3, с. 5–14]. І гэта не проста цяжкасці перакладу з англійскай мовы на рускую. Гэта іншая праблема, якая можа разглядацца ў канцэпцыі розных дыскурсіўных практык. Для польскай інтэлектуальнай традыцыі, культуралізм перш за ўсё звязаны з працамі Флоріана

ПолесГУ

Знанецкага і яго тэксту «Культурная рэальнасць» [4], які быў надрукаваны яшчэ ў 1919 годзе. Іншымі словамі, гэта асобная адгалінаванне ў даследаванні культуры ў межах сацыялогіі. Увагу сацыялогіі пытанні культуры прыцягвалі і раней. Тут варта ўзгадаць практыка арыентаваны падыход да сацыялогіі культуры П. Бурдьё [6] і «культур-сацыялогію» У. Абушэнкі [5]. Але ж наша задача для дадзенага тэксту, на проста паказаць некаторыя «цяжкасці перакладу», а праблематызаваць і зрабіць зноў актуальным для даследавання пытанне, якім чынам сацыялогія ўлічвае культурны кантэкст пры вывучэнні грамадства? Іншымі словамі, не проста перакласці культуралізм як культуралогію, а прадставіць аргументы на карысць выкарыстання мадэлі сацыяльнага станаўлення, якая ўлічвае асаблівасці культурнай разнастайнасці і дазваляе вывучаць не абстрактнае грамадства, а працаваць са штодзённымі практыкамі розных сацыяльных груп.

Але ж перад тым каб апісаць мадэль сацыяльнага станаўлення П. Штомпка ўводзіць некалькі абмежаванняў.

Па-першае, гэта існаванне двух розных узроўняў сацыяльнай рэальнасці: «узроўню індывідуальнасці і супольнасці (татальнасці)» [1, с. 87]. І ў гэтым сэнсе, прадстаўлены адасобленымі індывідамі і прадстаўнікамі пэўных калектываў (асацыяцый, грамадскіх рухаў і інш.), а другі – гэта ўзровень абстрактных сацыяльных надіндывідуальных утварэнняў (грамадства, культура, цывілізацыя і інш.). Калі любыя праявы актыўнасці індывідаў інтрэпрэтуюцца на гэтых двух узроўнях. У выніку атрымоўваецца, што на узроўні індывідуальнасці асобы разглядаюцца як агенты, якія маюць пэўныя рамкі і вонкавыя абмежаванні для дзеяння. А на ўзроўні татальнасці ўся іх дзейнасць упісваецца ў наяўнасць сацыяльных структур, прадстаўнікамі якіх яны з'яўляюцца. Іншымі словамі, кожныя індывідуальныя дзеянні дэтэрмінаваны не толькі і не столькі ўнутранымі жаданнямі і памкненнямі асобы, колькі залежаць ад сацыяльных сувязей і ўпісанасці таго ці іншага індывіду ў сацыяльны кантэкст.

Па-другое, гэта адрозненне можа быць заўважана як рознасць ў рэжымах існавання сацыяльнай рэальнасці: «як патэнцыйна магчымага і наяўнага ці рэчаіснага» [1, с. 88]. Да першага адносяцца ўнутраныя тэндэнцыі, здольнасці, схільнасці, да другога – працэсы дзейнасць, трансфармацыі, паводзіны.

Калі аб'яднаць гэтыя чатыры пункты, то магчыма ўбачыць варыянт мадэлі сацыяльнага станаўлення, які ўключае ў сабе: структуры, агентаў, аперыраванне і дзейнасць, якая можа быць зафіксавана ў выглядзе наступнай табліцы [1, с. 88]:

| | Патэнцыйнасць | Рэчаіснасць |
|---|---|---|
| Татальнасць | Структура | Аперыраванне |
| Індывідуальнасць | Агент | Дзеянне |

Аднак гэта мадэль як і грамадства па вызначэнню не з'яўляецца чымсьці статычным, зафіксаваным і перадвызначаным, а наадварот – з'яўляецца дынамічным і ўвесь час свайго існавання знаходзіцца ў працэсе станаўлення. Таму аўтар дапаўняю гэту мадэль яшчэ і практычным вымярэннем, якім чынам дзейнасці агентаў трансфармуецца ў практыку і тым самым прыводзіць да пераменаў у грамадстве. Гэта дынаміка сацыяльных структур на думку П. Штомпкі апісваецца трыма прынцыпамі: інэрцыі, кантынуальнасці і паслядоўнасці.

У сваіх разважаннях П. Штомпка звяртаецца да ідэі Э. Гідэнса з амбівалентнасцю сацыяльных структур і спрабуе паказаць амбівалентны характар культуры. «З аднаго боку культура надае дзейнасці аксіалагічную, нарматыўную і гнасеалагічную арыентацыю. З іншага – дзеянні фарміруюць і трансфармуюць культуру, гэтыя дзеянні з'яўляюцца асноўным фактарам утварэння новай культуры ці яе морфагенезу» [12, с. 42–43].

Пры гэтым мы разумеем, што сацыяльныя стуктуры не выходзяць на вуліцы і з'яўляюцца нябачнымі, але пры гэтым працягваюць існаваць і аказваць уплыў на паводзіны індывідаў. Нават калі мы не можам бачыць сацыяльныя структуры, то гэта не значыць, што



Полесгу

іх немагчыма даследаваць таму, што «структуры раскрываюцца ў аперацыях» [8, с. 270]. І ў гэтым таксама магчыма пабачыць дуальнасць агентаў, як суб'ектаў дзеяння, калі непасрэдна самі агенты з'яўляецца прадуктам сацыяльный стурктуры і пэўным рэсурсам для канструявання гэтых самых структур. Як падкрэслівае П. Штомпка «няма безструктурных агентаў і няма безагентных стурктур, але ў той жа час, структуры не растваравюцца ў агентах, і агенты не паглынаюцца структурамі» [8, с. 272]. Нешта падобнае мы можам пабачыць на ўзроўні культуры, калі кожны прадстаўнік пэўнай культуры не проста выступае ў ролі яе носьбіту, але і можа выконваць ролю творцы гэтай самай культуры. Няма асобна рэальнасці агентаў і няма асобнай рэальнасці структур, усё зліта ў адзіную «фабрыку» па вытворчасці сацыяльнай рэальнасці, культуры, агульнага бачання свету.

Першапачатковая мадэль сацыяльнага станаўлення дапаўняецца яшчэ адным істотным радком, які ўлічвае індывідуальную дзейнасць агентаў і ўзровень практыкі, як частку культуры штодзённасці: «Практыка з'яўляецца месцам сустрэчы аперацый і дзеянняў» [8, с. 273]. Гэты канцэптуальны падыход які не спрабуе звесці індывіда да шруба ці ніта сацыяльнай машыны, які паслухмяна выконвае перадвызначаную сацыяльную ролю, або дзейнічае абсалютна аўтаномна, не звяртаючы ўвагу на сацыяльныя нормы і абмежаванні. Замест гэтага прапаноўваецца трэці, часовы ўзровень, які імкнецца схапіць і асэнсаваць сутнасць сацыяльнай рэальнасці, спецыфічную сацыяльную тканіну і гэта магчыма з дапамога практыкі. «Практыка ў сваю чаргу, дзякуючы зваротнай сувязі, рашучым чынам уплывае на свядомасць. Праз практыку людзі атрымоўваюць перакананні і правяраюць іх, атрымоўваюць пацвярджэнне праўдзівасці ці памылковасці тых ці іншых заяў і ўласных ідэй» [8, с. 280]. У выніку мадэль сацыяльнага станаўлення можа выглядаць наступны чынам: [1, с. 97].

| | Патэнцыйнасць | Рэчаіснасць |
|---|---|---|
| Татальнасць | Структура | Аперыраванне |
| Рэальнасць | Дзейнасць агентаў | Практыка |
| Індывідуальнасць | Агенты – суб'екты дзейнасці | Дзеянне |

Канцэпцыя сацыяльнага станаўлення актыўна развіваецца і дапаўняецца аўтарам. Некаторыя з яго ідэй, напрыклад «сацыялагічнае ўяўленне»[9] і магчымасць навучыцца інакш бачыць ці ўяўляць грамадства, зрабілі П. Штомпку класікам сучаснай сацыялогіі.

Прапанавая ім мадэль сацыяльгана станаўлення дазваляе інакш убачыць грамадства. «Соцыум прадстае зараз як бесперапынны, вечны рух. Мы можам узяць любы кампанент мадэлі ў убачым, як яна дзейнічае ў часе: у ёй любы факт з'яўляецца падзеяй, любы агент – суб'ектам дзеянняў, любы стан – толькі фазай бягучага працэсу» [8, с. 292]

У сваім больш позніх працах П. Штомка працягвае канструяваць і апісваць мадэль сацыяльнага станаўлення і прыходзіць да яшчэ аднаго істотнага элемента ўсёй сацыяльнай сістэмы: даверу. Страта даверу раўназначна страце агульнага сэнсу ва ўсім, што адбываецца навокал на розных сацыяльных узроўнях. Атрымоўваецца, што мы можам разважаць пра сацыяльнае станаўленне толькі калі маем давер да тых сацыяльных структур, агентамі якіх з'яўляемся, калі давяраем практыцы, дзеянне якой адчуваем на сабе. «Рэальна грамадства ўспрымаецца не толькі як кааліцыя інтарэсаў, але і як маральная супольнасць <...> якая прадугледжвае асаблівае стаўленне да іншых, якія вызначаюцца намі як «Мы»» [12, с. 44]. Маральная супольнасць грунтуецца на трох кітах: давер, лаяльнасць і салідарнасць.

У гэтым кантэксце цікава адзначыць спробы П. Штомпкі асэнсаваць місію сацыялогіі ў посткамуністычных грамадствах [11], у якіх разбурана давер да ранейшых сацыяльных інстытутаў «рэальнага сацыялізму» [8, с. 309–311], а да новых сацыяльных утварэнняў ён яшчэ не склаўся. Калі перад тым як казаць пра давер да новых структур, неабходна ўсвядоміць іх магчымасці і абмежаванні, ці іншымі словамі: «дзеля таго каб у

поўнай меры выкарыстоўваць магчымасці дэмакратыі, іх спачатку неабходна ўсвядоміць» [8, с. 281]. Разуменне і тлумачэнне сацыяльных пераўтварэнняў у постсавецкіх грамадствах, не можа быць рэдукавана да экспарту дэмакратыі, бо грамадству неабходна змяніцца. І гэтыя змены, гэты працэс сацыяльнага станаўлення можа быць здзейснены праз некалькі мадэляў: 1) праз інстытуцыялізацыю адхіленняў ад нормы; 2) праз накапленне інавацый. «Калі іннавацыі пашанцавала выстаяць, то рашаючае значэнне атрымоўвае яе легітымацыя – у адваротным выпадку, існаванне новых норм, каштоўнасцей і інстытутаў ненадзейна» [8, с. 320]. Гэта можна параўнаць з дынамікай працэсу «нарматыўнай віртуальнасці» [7] у сучасным грамадстве, аналізам якога П. Штомпка займаецца ў сваіх працах [10]. Тэма культурнай ідэнтычнасці можа быць адным з першых пытанняў для пераасэнсавання сучаснай культуралогіяй бягучага сацыяльна-культурнага кантэксту. І гэты аналіз будзе ажыццяўляцца без катэгарыяльнага апарату руская філасофіі XIX ст.

У выніку зробленага тэарэтычнага аналізу, магчыма зрабіць наступныя падсумаванні. Мадэль сацыяльнага станаўленне патэнцыйна можа быць прыдатнай для выкарыстання ў межах культуралогіі, для разумення і тлумачэння трансфармацый у сферы культуры. Мадэль сацыяльнага станаўленне дазваляе патлумачыць не толькі сацыяльныя працэсы на ўзроўні сацыяльных груп, але і прыдатна для выкарыстання для культуралагічных патрэб, а дакладней паказаць якім чынам сёння адбываюцца змены і трансфармацыі. Кірункам для далейшага даследавання можа быць верыфікацыя дадзенай тэарэтычнай мадэлі сацыяльнага станаўлення на сучасным беларускім эмпірычным матэрыяле.


1. Sztompka P. Society in Action: The Theory of Social Becoming / P. Sztompka, Cambridge : Polity Press, 1991. – 211 p.
2. Hall S. Cultural Identity and Diaspora // Identity: Community, Culture, Difference / ed.by J. Rutherford, London : Lawrence & Wishart, 1990. – P.222–237.
3. Sztompka P. Trust: A Sociological Theory / P. Sztompka, NY : Cambridge University Press, 2003. – 214 p.
4. Znaniecki F. Cultural Reality / F. Znaniecki, Chicago : University of Chicago Press, 1919. – 360 p.
5. Абушенко В.Л. «Культур-социология»: возможность иного взгляда на социальную теорию // Вопросы социальной теории. № 2 (1). – 2008.– С.329-344.
6. Бурдье П. Практический смысл / П. Бурдье, Санкт Петербург : Алетейя, 2001. – 562 с.
7. Крывалап А.Д. Нарматыўная віртуальнасць як складнік працэсу інкультурацыі // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия Е, Педагогические науки. №7. 2017. – С. 184–187.
8. Штомпка П. Социология социальных изменений / П. Штомпка, Москва : Аспект Пресс, – 1996. – 416 с.
9. Штомпка П. Теоретическая социология и социологическое воображение // Социологический журнал. №1. – 2001. – С. 148–158.
10. Штомпка П. Социология. Анализ современного общества , Москва : Логос, 2005. – 664 с.
11. Штомпка П. Миссия социологии в посткоммунистических обществах / П. Штомпка // Посев. № 6. 2006. – С.4–10.
12. Штомпка П. Доверие - основа общества / П. Штомпка, Москва : Логос, 2012. – 440 с.


Полесгу